■ Спорт-тайм

ПРАЗ СЕМ ГАДОЎ...

Менавіта столькі спатрэбілася беларускім гандбалісткам, каб зноў выйсці ў плэй-оф адборачнага турніру чэмпіянату свету

У штотыднёвым спартыўным агляддзе «Звязды» расказваем пра тое, як прайшоў кваліфікацыйны турнір у Мінску, як адыграла мінскае «Дынама» ў чарговым матчы КХЛ і хто стаў уладальнікам валейбольнага Кубка Беларусі.

1. Жаночая зборная краіны па гандболе без паражэнняў прайшла першы кваліфікацыйны раўнд чэмпіянату свету 2017 года і зараз згуляе ў плэй-оф. На пляцоўцы Палаца спорту «Уручча» падапечныя Томажа Чатэра перамаглі зборную Турцыі — 37:23, затым каманду Швейцарыі — 35:27 і разграмілі гандбалістак Косава 31:13.

— Мы былі фаварытамі кваліфікацыі і паказалі гэта на пляцоўцы. Некаторыя дзяўчаты мелі праблемы са здароўем, але правялі ўсе матчы як трэба. Трохі захваляваліся ў пачатку матча з турчанкамі. Але толькі таму, што гэта была першая гульня на турніры. Затым хутка супакоіліся і давялі матч да перамогі. Разумелі, што самая важная гульня будзе са швейцаркамі, таму выбралі актыўную абарону на гэтую сустрэчу. Задумка спрацавала. У матчы з камандай Косава, праўда, ужо выпусцілі другі склад — так як вырашылі да гэтага часу галоўную задачу. Зараз будзем чакаць саперніка па накаўт-раўндзе, — адзначыў **галоўны трэнер беларускай зборнай Томаж Чатэр.**

Нагадаем, нашы дзяўчаты прабіліся ў плэй-оф чэмпіянату свету ўпершыню з 2009 года. Беларускі толькі двойчы станавіліся ўдзельніцамі фінальнай стадыі планетарных форумаў — у 1997 годзе (занялі 16 месца) і ў 1999-м (былі 14-мі).

Лёсаванне плэй-оф ЧС-2017 адбудзецца 18 снежня.

2. Хакеісты мінскага «Дынама» прайгралі трэці матч запар у чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі. На гэты раз на сваім лёдзе дынамаўцы былі слабейшыя за магнітагорскі «Металург» — 2:4. Адзначым, што ў варотах упершыню ў гэтым сезоне згуляў Кевін Лаланд, які атрымаў траўму яшчэ ў пачатку верасня ў матчы за зборную.

— Хакейны сезон не абыходзіцца без узлётаў і падзенняў. Ты павінен падкрэсліваць нешта для сябе ў кожным матчы — гэта будзе даваць нам сілы станавіцца найлепшымі. Я і ўсе гульцы верым, што рухаемся ў правільным кірунку. Мы ведаем аб гульнявых момантах, якія трэба палепшыць. У нас па-за гульнёй шмат форвардаў і вядучы абаронца — гэта няпростая сітуацыя, у якой мы знаходзімся ўжо тры месяцы, — пракаментаваў становішча сваёй каманды **галоўны трэнер мінскага «Дынама» Крэйг Вудкрафт.**

Зараз у актыве мінскага «Дынама» 58 ачкоў пасля 37 згуляных матчаў і 7-е месца ў турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі Кантынентальнай хакейнай лігі. Свой наступны паядынак «зубры» правядуць сёння на лёдзе «Мінск-Арэны» супраць хакеістаў браціслаўскага «Слована».

3. «Мінчанка» стала ўладальнікам Кубка Беларусі па валейболе, выйграўшы фінальны матч розыгрышу ў брэсцкай «Вікторыі» з лікам 3:0.

Адзначым, што валейбалісткі «Мінчанкі» ўпершыню перамаглі ў Кубку Беларусі за апошнія пяць гадоў. Раней уладальнікам ганаровага трафея станавіліся «Прыбужжа» (у 2015-м і 2014 годзе), гродзенскі «Нёман» у 2013 годзе, з 2008 па 2012 гады пераможцам станавіўся баранавіцкі «Атлант».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

Даты Падзеі Людзі

6 СНЕЖНЯ

1520 год — нарадзілася Барбара Радзівіл, каралева польская і вялікая княгіня літоўская. Была другой жонкай Жыгімонта II Аўгуста. Атрымала выдатную адукацыю дома: ведала некалькі замежных моў, займалася гісторыяй, літаратурай, маляваннем, музыкай, танцамі, верхавой яздой. Памерла ў 1551 годзе, праз паўгода пасля сваёй каранацыі. Пахавана ў Віленскім кафедральным касцёле. Барбара Радзівіл стала гераіняй многіх легендаў, у якіх выступае ў вобразе Чорнай дамы, а гісторыі рамантычнага кахання Барбары і Жыгімонта прысвечаны шматлікія мастацкія творы.

1590 год — рускі цар Фёдар Іаанавіч па ініцыятыве Барыса Гадунова выдаў указ, які забараняў пераходы сялян ад аднаго ўладальніка да іншага нават у Юр'еў дзень. (Юр'еў дзень, калі ўшаноўваецца памяць святога Георгія, завяршаў гадавы цыкл сельскагаспадарчых работ і дазваляў сялянам, якія выплацілі збор, у перыяд часу за тыдзень да Юр'ева дня і тыдзень пасля яго сысці ад старога гаспадара.) Гэтая забарона стала нечаканай для сялян, менавіта тады і з'явілася прымаўка: «Вось табе, бабуля, і Юр'еў дзень!»

1896 год — 120 гадоў таму нарадзіўся (г. Віцебск) Мікалай Кір'янавіч Рыжы, генерал-палкоўнік артылерыі. Удзельнік савецка-фінскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну на Паўднёвым, Забайкальскім франтах — начальнік артылерыі корпуса, арміі, начальнік артылерыі — намеснік камандуючага войскамі фронту. Удзельнік абароны Адэсы, Севастопаля, Керчанска-Феадасійскай дэсантнай аперацыі 1941—1942 гадоў, савецка-японскай вайны. Памёр у 1972 годзе.

1899 год — нарадзіўся (г. Шклоў) Навум Ісакавіч Эйцінгон, савецкі ваенны дзеяч, разведчык, генерал-маёр. Скончыў Ваенную акадэмію ў Маскве, ведаў некалькі замежных моў. Працоўную дзейнасць пачаў у 1917 годзе ў Магілёве, дзе некаторы час быў членам мясцовай арганізацыі партыі сацыял-рэвалюцыянераў (эсэраў), з якой пасля выйшаў. З 1920 года — у органах ВЧК ў Гомелі, Башкірыі. У 1925—1939 гадах — намеснік рэзідэнта, рэзідэнт савецкай разведкі ў Кітаі, ЗША, Іспаніі, Францыі. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў аперацыі па ліквідацыі Л. Троцкага ў Мексіцы. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны прызначаны намеснікам кіраўніка асобай групы пры наркаме ўнутраных спраў СССР, займаўся адпраўкай савецкіх разведчыкаў у нямецкі тыл, нелегальна працаваў у Турцыі. З 1944 года ўдзельнічаў у зборы інфармацыі аб амерыканскай атамнай бомбе. У 1953 быў арыштаваны і асуджаны да 12 гадоў турмы. Пасля вызвалення ў 1964 годзе працаваў у знешнегандлёвым аб'яднанні «Міжнародная кніга» ў Маскве. Памёр у 1981 годзе. Рэабілітаваны ў 1992-м.

Было сказана

Ніна МАЦЯШ, паэтэса:
«Хацела аднаго ад долі: душою з небам гаварыць».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.12	16.49	7.37
Віцебск —	9.09	16.31	7.22
Магілёў —	9.02	16.39	7.37
Гомель —	8.51	16.44	7.53
Гродна —	9.26	17.05	7.39
Брэст —	9.19	17.14	7.55

Месяц

Маладзік 29.11—06.12. Месяц у сузор'і Рыбы.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Барыса, Макара, Рыгора, Фёдара.*
К. *Емяльяна, Здзіслава, Зянона, Мікалая.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Калі я ў сеціве і не адказваю на вашы паведамленні...

Гэта значыць, што нехта глядзіць мульцікі або прыйшоў з работы «танкіст»!

— Вовачка, складзі сказ са словамі «кот» і «глядзець».

— Калі я выпадкова наступіў кату на лапу, ён закрычаў: «Глядзець трэба, куды наступаеш!»

— Можаце! Выганіце нас адсюль, калі ласка!..

Пазнаёміўся хлопец з прыгожай дзяўчынай, тая запрасіла яго да сябе дадому. На парозе іх сустракае яе маці. Хлопец:

— Я хачу прасіць рукі вашай дачкі. Яна прыгожая, як шэдэўр мастака.

Маці *(у хату)*:

— Гэй, Рубенс, хопіць спаць, ідзі з будучым зяцем знаёміцца!

Учора жонка зацягнула мяне ў краму парфумерыі. Тут падыходзіць прадавец-кансультант з пытаннем:

— Магу вам дапамагчы?

І я шчыра так адказваю:

«ЗВЯЗДА» НА СВЯТЫ ДОРЫЦЬ... СУВЯЗЬ!

А што, як не сувязь, самае галоўнае сёння ў адносінах паміж людзьмі? Зыходзячы з гэтага меркавання, мы ў якасці прызоў для розыгрышу сярод падпісчыкаў гэтым разам прапануем прылады для камунікацыі з блізкімі людзьмі і з усім астатнім светам — тэлефоны і планшэт.

Тэлефонам сёння нікога не здзівіш, але тут мы падумалі найперш пра нашых сталых чытачоў і пра маладзейшых, якія клапоцяцца аб сваіх бацьках. Зручная клавіятура з вялікімі, добра відочнымі кнопкамі, вялікі экран, дзве SIM-карты — выдатны падарунак для старэйшага ў вялікай і дружнай сям'і. Не забыліся і пра малодшых — галоўны прыз рэкламнай гульні — сучасны планшэт, які падтрымлівае сувязь фармату 4G і мае шмат іншых цікавых і патрэбных функцый.

Каб стаць удзельнікам розыгрышу гэтых патрэбных падарункаў, варта толькі аформіць падпіску на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе, запоўніць адзін з купонаў, якія будуць змяшчацца ў газеце на працягу снежня, выразаць яго і даслаць на адрас рэдакцыі. Магчыма, фартуна абярэ менавіта вас.

Выпісвайце «Звязду» — будзьце заўжды на сувязі!

Умовы рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» змешчаны ў нумары ад 3 снежня.

Планшэт Asus ZenPad 10 Z300CNL-6A025A 000

Мабільны тэлефон Fly FF241 чорны

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал і 1 паўгоддзе 2017 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на I квартал і 1 паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) _____ (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ОАО «Рыбхоз «Красная Зорька» в связи с ликвидацией
ПРОИЗВОДИТ ПРОДАЖУ ТОВАРНОЙ РЫБЫ:

- КАРП, ТОЛСТОЛОБИК;
- РЫБОПОСАДОЧНЫЙ МАТЕРИАЛ: КАРП.

По вопросам приобретения обращаться по тел. 8 029 645 45 14, Лукашев Д.Л.

УНП 400044343

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4880. Нумар падпісаны ў 19.30 5 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12